Аляксандр РАДЗЬКОЎ

# РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі

Слова пісьменніка




## ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА МАЁЙ РЭКТАРСКАЙ ПРАЦЫ

За час маёй працы ў дэканаце і загадчыкам кафедры мы з калегамі напісалі некалькі вучэбных дапаможнікаў па алгебры і тэорыі лікаў, я працягваў займацца вывучэннем праблем навучання матэматыцы будучых настаўнікаў, у мяне паступова вымалёўваліся контуры доктарскай дысертацыі — ад працы загадчыкам кафедры я атрымліваў задавальненне. Але ў гэты час нашаму інстытуту даручылі стварыць вучэбны комплекс для тэарэтычнага вывучэння і эксперыментальнай практычнай рэалізацыі ідэй бесперапыннага навучання. У Беларусі паўсюль на базе сярэдніх школ, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, тэхнікумаў і ВНУ-інстытутаў пачалі адкрывацца гімназіі, ліцэі, каледжы, універсітэты. Трэба было прадметна вывучыць, колькі іх патрэбна і якімі яны павінны быць, як паміж сабою ўзаемадзейнічаць, прадумаць і ажыццявіць іх забеспячэнне якаснай вучэбна-метадычнай дакументацыяй і высокакваліфікаванымі кадрамі. Для каардынацыі гэтай працы інстытуту выдзялялася стаўка прарэктара па вучэбнай рабоце. На гэтую пасаду рэктар Я. П. Кудрашоў прызначыў мяне. Разгарнуўшы вучэбны комплекс, мы зразумелі, што тым самым стварылі навуковую лабараторыю па вывучэнні праблем рэалізацыі ў лакальных умовах бесперапыннай адукацыі. Убачыўшы маштаб даследчых прац у гэтым кірунку, Міністэрства адукацыі выдзеліла нам грант, мы атрымалі фінансаванне на неабходнае навуковае абсталяванне і аплату працы тых вучоных, якія аказаліся задзейнічаны ў гэтым праекце. Курыраваў нашу работу начальнік упраўлення вышэйшай школы міністэрства прафесар М. М. Плескацэвіч, а да распрацоўкі даволі аб'ёмнай тэматыкі мы запрашалі ў наш часовы навуковы калектыў вучоных з многіх ВНУ Беларусі — на палову, чвэрць стаўкі супрацоўніка, — часам іх колькасць даходзіла да 120. Безумоўна, такія стасункі з вучонымі і практыкамі па актуальных тэмах вывучэння перспектыў развіцця сучаснай адукацыі ўзбагачала навуковымі ведамі, стварала нашаму ўніверсітэту пэўны аўтарытэт. У рамках гэтага маштабнага праекта я пашыраў і свае даследаванні па праблемах навучання матэматыцы школьнікаў і студэнтаў, у мяне з'явіліся аспіранты, адкрыўся спецыялізаваны савет па абароне кандыдацкіх дысертацый пад маім старшынствам. Тым самым я набываў вопыт кіраўніцтва навуковымі даследаваннямі, што было надзвычай важна для маёй будучай працы рэктарам.

Я пралічыў, што для развіцця навуковага патэнцыялу майго ўніверсітэта яго калектыў павінен папаўняцца штогод на 17-18 кандыдатаў і 2-3 дактароў навук. Разлічваць на прыток такога ўзроўню спецыялістаў аднекуль, з іншых ВНУ, не даводзілася. Усесаюзны конкурс на замяшчэнне вакантных пасад ужо не аб'яўляўся. Трэба было разлічваць перш-наперш на ўласныя сілы. З падрыхтоўкай кандыдатаў праблемы былі толькі па ўпершыню адкрытых ва ўніверсітэце спецыяльнасцях: эканоміцы, правазнаўстве, геаграфіі, замежнай мове. Па традыцыйных кірунках — матэматыка, фізіка, гісторыя, філалогія, біялогія, хімія, псіхалогія, педагогіка, фізічнае выхаванне — працэс падрыхтоўкі маладых вучоных быў наладжаны. Тут традыцыйна дапамагалі Акадэмія навук і сталічныя ўніверсітэты. А па новых спецыяльнасцях я як рэктар разам са сваімі калегамі-вучонымі пачаў шукаць дзейсныя спосабы падрыхтоўкі для ўніверсітэта кандыдатаў навук. І выкарыстоўваў для гэтага асабістыя кантакты. Дарэчы, развіццё навукі ў асноўным на іх і пабудавана. Напрыклад, падрыхтоўка дысертацый па замежных мовах. У Магілёве мы з цяжкасцю знайшлі выкладчыкаў па гэтым профілі для забеспячэння вучэбнага працэсу патрэбнай якасці, а тут падрыхтоўка дысертацый. І я паехаў з паклонам да рэктара Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта прафесара Наталлі Пятроўны Баранавай. Запрасіў каманду вучоных яе ўніверсітэта прыехаць да нас у Магілёў — выступіць перад выкладчыкамі і студэнтамі. Наталля Пятроўна асабіста ўзначаліла гэту дэлегацыю, агледзела матэрыяльную базу факультэта замежных моў, разам з калегамі арганізавала круглыя сталы для абмену вопытам з нашымі выкладчыкамі, сустрэлася з найлепшымі студэнтамі для абмеркавання парадку паступлення ў аспірантуру яе ўніверсітэта. Гэтыя сустрэчы вызначылі наша доўгатэрміновае і прадукцыйнае супрацоўніцтва, выпускнікі Магілёўскага ўніверсітэта і цяпер абараняюць дысертацыі ў спецыялізаваных саветах лінгвістычнага ўніверсітэта. Але мне давялося і «заплаціць» Наталлі Пятроўне за гэтую дапамогу. Пасля яе візіту на працу ў лінгвістычны ўніверсітэт перайшла загадчык кафедры англійскай мовы дацэнт Таццяна Мікалаеўна Андрэева — найлепшы на той час выкладчык гэтага профілю. З таго часу мы з Наталляй Пятроўнай сябруем, і яна істотна падтрымала мяне ў працы міністрам адукацыі.

Калі з падрыхтоўкай кандыдатаў навук нашы дзеянні былі ўвогуле зразумелыя, то з папаўненнем выкладчыцкага складу дактарамі навук узніклі вялікія напружанасці. Вучоны такога ўзроўню — гэта даволі рэдкая з'ява нават у акадэмічным асяроддзі. Статыстыка падрыхтоўкі навуковых кадраў у Савецкім Саюзе сведчыла, што з дзесяці кандыдатаў у сярэднім выходзіць адзін доктар. Доктарская дысертацыя — вынік даследавання буйнай навуковай тэмы, фарміраванне новага навуковага кірунку, стварэнне прадуктыўнай навуковай школы. Таму ў саіскальніку гэтай навуковай ступені павінны сысціся нямала фактараў, як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных. Некаторых дацэнтаў даводзіцца скіраваць, падштурхнуць да вельмі няпростай і максімальна працаёмкай работы па падрыхтоўцы доктарскай дысертацыі, падтрымаць іх у гэтай справе, рэальна дапамагчы. Яшчэ раз вяртаюся да думкі, што рэктарам універсітэта павінен быць доктар навук. Інакш ён не толькі не здолее прадметна дапамагчы саіскальнікам гэтай вучонай ступені, але і псіхалагічна будзе мала зацікаўлены ў іх падтрымцы. Я разумеў, наколькі важная для развіцця ўніверсітэта праца вядучых вучоных над доктарскімі дысертацыямі, таму адважыўся на наступнае дзеянне.

У адзін з працоўных дзён папрасіў свайго памочніка Лідзію Пятроўну (яна працавала ў прыёмнай рэктара з часу Кудрашова) запрасіць да мяне пятнаццаць дацэнтаў з розных кафедр. Іх спіс склаў сам, ведаў жа выкладчыкаў я добра. Яны сабраліся ў прыёмнай у 16.00 і, разглядваючы адзін аднаго, ніяк не маглі зразумець, чаму іх рэктар запрасіў да сябе ў такім складзе. Яшчэ болей здзівіліся, калі ў кабінеце ўбачылі стол, сервіраваны да чаю ці кавы. Да калег я звярнуўся са словамі:

— Усе тут прысутныя — патэнцыяльныя дактары, і для развіцця ўніверсітэта надзвычай важна, каб вы абаранілі доктарскія дысертацыі. Скажыце, калі вы плануеце выхад на абарону і чым вам універсітэт можа дапамагчы ў гэтым?

У кабінеце павісла доўгая паўза. З адказамі я не падганяў. І паступова людзі разгаварыліся. Абставіны гэтаму спрыялі. Нехта папрасіў камандзіроўку ў архівы Санкт-Пецярбурга, нехта — стажыроўку ў Акадэміі навук, нехта — сродкі для выдання манаграфіі. Усе прапановы і просьбы былі рэальна выканальныя. Важна і тое, што вучоныя розных навуковых спецыяльнасцяў свабодна паміж сабою абмяркоўвалі праблемы завяршэння дысертацыйных даследаванняў, раілі адзін аднаму шляхі рацыянальных дзеянняў у гэтым кірунку. Я з цікавасцю слухаў гэтыя дзелавыя размовы. Сам фармат іх сустрэчы меркаваў і магчымасць кожнаму з прысутных пазней асабіста зайсці да рэктара па ўзніклых у працэсе выхаду на абарону дысертацыі пытаннях.

Гэтая сустрэча вучоных з рэктарам атрымала ва ўніверсітэце добры рэзананс. Дацэнты, якія ў ёй удзельнічалі, прыкметна павысілі сярод калег свой навуковы аўтарытэт, бо на ўзроўні рэктара іх прызналі патэнцыяльнымі дактарамі навук. Але зусім нечакана для мяне захваляваліся тыя дацэнты, якіх не паклікалі на сустрэчу. Яны ж лічылі сябе не горшымі за запрошаных! Работа над дысертацыямі ва ўніверсітэце прыкметна ажывілася. Не так хутка, як бы мне гэтага хацелася, але ўсё ж пайшлі абароны.

Хачу выказаць некалькі меркаванняў з нагоды напісання дысертацый і прысуджэння навуковых ступеняў. Неяк у размове аб прызначэнні ў грамадстве вышэйшых навуковых устаноў філосаф М. І. Вішнеўскі сказаў:

— Універсітэт — гэта кропка судакранання навукі і адукацыі.

У заходніх краінах навуковыя даследаванні ў многім факусіруюцца ва ўніверсітэтах. У нас у краіне, і па традыцыі, і нават заканадаўча, галаўной навуковай арганізацыяй з'яўляецца Нацыянальная акадэмія навук, хоць па сукупнасці навуковай прадукцыі ўніверсітэты ёй не саступаюць. А ўжо падрыхтоўка кадраў для навуковай галіны — перш за ўсё за ВНУ. І таму нядзіўна, што колькасць кандыдатаў і дактароў навук ва ўніверсітэтах прыкметна пераўзыходзіць іх наяўнасць у акадэмічным асяроддзі.

Калі ва ўніверсітэце няма навуковых даследаванняў, не развіваюцца навуковыя школы, выкладчыкі не даюць навуковых рэзультатаў, студэнты не ўцягнуты ў творчы працэс — гэта не ўніверсітэт! І адбор студэнтаў у аспірантуру для наступнага выкладання ў ВНУ павінен у першую чаргу грунтавацца на выяўленні іх здольнасцяў да даследчай дзейнасці. Калі вядомы педагог — прафесар А. П. Мінакоў — сказаў, што выкладчык-вучоны ВНУ і свеціць, і грэе, а выкладчык, які не займаецца навуковымі даследаваннямі, нават вельмі добры, на жаль, толькі блішчыць. Я гэта адчуў ужо на першым курсе. Да нас на фізмат тады пасля аспірантуры БДУ прыйшлі выкладаць таленавітыя маладыя вучоныя — аналітык І. І. Мартынаў, геаметры А. К. Лапкоўскі, Я. В. Караёнак, фізік К. К. Жылік. На факультэце ўжо працавалі аўтарытэтныя вучоныя — дацэнты Б. М. Архіпаў, М. М. Вінаградаў, М. П. Ляльчук, А. А. Мазанік, М. І. Урбановіч. У гэты ж час набірала сілу і ў далейшым атрымала міжнародную вядомасць навукова-метадычная школа прафесара А. А. Столяра. І гэтыя выкладчыкі-вучоныя адразу захапілі нас працэсам навуковай творчасці. Мы не толькі слухалі іх захапляльныя лекцыі, працавалі з імі на практычных і лабараторных занятках, пісалі пад іх уважлівым кіраўніцтвам курсавыя і дыпломныя работы, але і гулялі з імі ў баскетбол, удзельнічалі ў мастацкай самадзейнасці, разам рыхтавалі першакрасавіцкія «Гумарыны», дапамагалі арганізоўваць навуковыя семінары, канферэнцыі і самі ж у іх удзельнічалі. Нядзіўна, што многія з нас пазней былі запрошаны на кафедры для выкладчыцкай працы і самі сталі вядомымі вучонымі, кандыдатамі і дактарамі навук. Такая ўніверсітэцкая атмасфера навуковага пошуку, напружаных, але вельмі захапляльных заняткаў даследчыцкай працай вызначыла для мяне назаўсёды неабходны ўзровень прысутнасці ў ВНУ творчага напалу, задзейнічання ў вучэбным працэсе таленавітых вучоных, натуральнага прыцягнення ў навуковы пошук студэнцкай моладзі.

З першых дзён працы асістэнтам кафедры алгебры і геаметрыі я разумеў, што трэба вызначыцца ў тэматыцы навуковых даследаванняў, паступіць у аспірантуру, абараніць кандыдацкую дысертацыю, стаць дацэнтам. Гэта неабходны прафесійны рост выкладчыка ВНУ. І навакольныя абставіны на кафедры, на факультэце і ў інстытуце ўвогуле гэтаму садзейнічаюць. Болей за тое, тут істотныя і матэрыяльныя стымулы: кандыдату навук павінны даць кватэру, у яго ў два разы большым становіцца заробак. Але самае галоўнае, пасля абароны дысертацыі ты афіцыйна становішся дыпламаваным спецыялістам ВНУ, прафесіяналам у сваёй справе, што, безумоўна, маральна цябе падтрымлівае, умацоўвае твой аўтарытэт.

Мне, як рэктару і як міністру, часта даводзілася дыскусіраваць з кіраўнікамі навуковай сферы краіны пра прызначэнне абарон кандыдацкіх дысертацый, узровень афіцыйных да іх патрабаванняў. Я лічу, што кандыдацкая дысертацыя — гэта перш за ўсё кваліфікаваная праца, якая дазваляе на прыкладзе вырашэння канкрэтнай навуковай задачы прадэманстраваць прафесійны ўзровень даследчыка, яго творчы патэнцыял, у прыватнасці, адпаведнасць прызначэнню ўніверсітэцкага выкладчыка. На гэтым узроўні заўчасна патрабаваць ад саіскальніка вучонай ступені навуковых адкрыццяў, маштабнага эканамічнага эфекту ад укаранення рэзультатаў даследавання, арыгінальных тэорый і нечаканых высноў. Дыплом кандыдата навук, на мой погляд, — афіцыйнае пацвярджэнне прафесійнага росту, развіцця чалавека, яго прыдатнасці для працы ў навуковай лабараторыі, канструктарскім бюро, на ўніверсітэцкай кафедры. Я не заўсёды знаходзіў падтрымку гэтай пазіцыі ў кіраўнікоў навуковай сферы і нават у калег-рэктараў, але пры рэфармаванні навуковага патэнцыялу нашага ўніверсітэта кіраваўся такім прынцыпам. На гэта скіроўваў і сваіх аспірантаў. Дарэчы, усе яны паспяхова абараніліся, а найболей таленавітыя сталі дактарамі навук.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 25 чэрвеня.)*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня.)*